СН плюс. СВОБОДНЫЕ НОВОСТИ ПЛЮС

ЕЖЕНЕДЕЛЬНАЯ ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКАЯ ГАЗЕТА • ВТОРНИК № 37 (632) 22 сентября 2015 года

Тел. 238-37-40, E-mail: snplus@tut.by, www.sn-plus.com

ИЗДАЕТСЯ С СЕНТЯБРЯ 2002 ГОДА. ИЗДАТЕЛЬ: ООО «СНПЛЮС». ЦЕНА СВОБОДНАЯ

СКОЛЬКО ПОЛУЧАЕМ МЫ И НАШИ СОСЕДИ

Половина белорусов (если точнее, то 50,1%) получили в июле зарплату более 6 миллионов. При этом ежемесячный заработок 0,7% работников не дотягивал до 3 миллионов, сообщает Нацбанк.

По данным регулятора, еще у 8,9% у работников юрлиц заработная плата в июле была от 3 до 4 миллионов рублей. Ежемесячным заработком от 4 до 5 миллионов могли похвастаться 21,7% белорусов, а от 5 до 6 миллионов — 19,3%.

Реальная зарплата в июле по сравнению с аналогичным периодом 2014 года снизилась на 3,8%, а по сравнению с июнем этого года — увеличилась на 1,6%, уточнили в Нацбанке.

Напомним, средняя зарплата бюджетников в июле составила 5 миллионов 453 тысячи 200 рублей. По сравнению с июнем она упала почти на 107 тысяч рублей. При этом июльский средний заработок бюджетников отстает от среднего по стране почти на 1,6 миллиона.

Тем временем число организаций—должников по выплате зарплат второй месяц кряду продолжает сокращаться. На 1 сентября не смогли вовремя получить свои деньги 68 тысяч белорусов, а предприятия должны своим работникам в общей сложности 276 миллиардов рублей.

КАК СРЕДНЯЯ ЗАРПЛАТА БЕЛОРУСОВ ОТЛИЧАЕТСЯ ОТ ДОХОДОВ СОСЕДЕЙ

Средняя зарплата россиян в мае, по данным Росстата, в пересчете составила 9,6 миллиона (все суммы в тексте приведены в белорусских рублях по курсу Нацбанка на 1 июня 2015 года). Больше всех зарабатывали специалисты, занятые в производстве кокса и нефтепродуктов — 42,7 миллиона рублей, а меньше всех — швеи, чья средняя зар-

плата составила всего 4,2 миллиона.

Майская инфляция в России составила 0,4%, а реальные доходы по итогам месяца упали на 6,4% по сравнению с аналогичным периодом прошлого года.

Еще в одной стране Таможенного союза — Казахстане — зарплаты также выше, чем у белорусов. Среднемесячный доход казахов в мае составил 9,8 миллиона рублей. Инфляция в этой стране держалась на уровне 0,3%. По росту цен на товары и услуги белорусы уже третий месяц опережают россиян и казахов.

Украинцы в мае в среднем получали 2,9 миллиона рублей, сообщает Государственная служба статистики. Больше всего в Украине зарабатывали не программисты, как в Беларуси, а работники авиационной отрасли — 13,2 миллиона. На втором месте идут финансисты и страховые агенты — 5,7 миллиона. Украинские же программисты в мае в среднем зарабатывали 4,7 миллиона. Меньше всего получили украинские медики и соцработники — 1,9 миллиона рублей.

Инфляция в Украине в мае упала до 2,2% по сравнению с апрельской в 14%. Реальная зарплата украинцев стала меньше на 27,6% по сравнению с аналогичным периодом прошлого года.

Разрыв между зарплатами белорусов и граждан ЕС еще более существенный. К примеру, жители Латвии в первом квартале этого года получали в среднем на руки 9,7 миллиона рублей (579 евро), Литвы — 9,08 миллиона (543 евро), сообщает delfi.lv.

СРАВНИМ ПОСОБИЯ ПО БЕЗРАБОТИЦЕ

Как ранее сообщал TUT.BY, белорусское пособие по безработице существенно уступает выплатам нетрудоустроенным в других странах. Например, в Украине среднее пособие в июне составило 868 тысяч рублей (все суммы в тексте приведены в белорусских рублях по курсу Нацбанка на 31 июля). В России выплаты безработным варьируются от 219 тысяч до 1,3 миллиона рублей.

Еще в одной стране Таможенного союза — Казахстане — средний размер пособия составляет 2,2 миллиона рублей. При стаже более 24 месяцев безработный может получать материальную помощь в течение 4 месяцев, а если стаж меньше — 2—3 месяца.

Польские безработные получают 3,3 миллиона рублей в течение первых 90 дней после регистрации в центре занятости, а в последующем — 2,7 миллиона.

Тем временем Минтруда прогнозирует, что уровень безработицы за пятилетку может удвоиться.

TUT.BY

Зарплате белорусов не угнаться за зарплатой А. Лукашенко

Центральная избирательная комиссия опубликовала данные о доходах и имуществе кандидатов в президенты за 2014 год.

Выяснилось, что в минувшем году Лукашенко получал самую высокую заработную плату — 4481 доллар за месяц. Это в полтора раза больше, чем пять лет назад, и в одиннадцать раз больше, чем пятнадцать лет назад.

И можно было бы порадоваться за Александра Григорьевича, если бы зарплата белорусов росла такими же темпами, но, увы, это отнюдь не так.

«Салідарнасць» решила сравнить, как успевали зарплаты белорусов за доходами их «президента».

Итак, согласно декларации, в 2000 году среднегодовой доход Александра Лукашенко составил почти 3,8 млн рублей, или 393 доллара в месяц по курсу Национального банка.

Заметим, что в те годы среднемесячная зарплата по стране, по данным

Белстата, составляла 82 доллара, или 58 916 рублей. Это сейчас белорусы могут похвастать, что получают, как президент в 2000-м, но в те годы разница между заработком главы государства и простым гражданином была в 4,8 раза.

Прошло пять лет, и уже к 2005 году среднегодовой доход Александра Лукашенко составил 59 млн рублей, или 2288 долларов в месяц. Белорусы же к этому времени смогли разбогатеть лишь до 215 долларов (463 741 рубль). Нетрудно посчитать, что за этот период глава государства стал получать в 10,6 раза больше своих граждан.

К следующим же выборам зарплата президента выросла не так сильно, как в предыдущий период. Согласно декларации, в 2009 году Александр Лукашенко заработал за год свыше 94 млн рублей, или 2810 долларов в месяц. То есть зарплата президента увеличилась всего на 522 доллара. Однако и этих денег обычные белорусы не увидели. К 2009-му их зарплаты увеличились всего на 137 долларов, составив 352 доллара (981 584 рубля).

«Салідарнасць»

В НОМЕРЕ:

ISSN 1818-6602

СТАБИЛЬНОСТЬ ИЛИ РАЗВИТИЕ

Меня волнует более всего даже не итог выборов, а придет ли избиратель. Это является самым главным… В конце концов, у нас государство над явкой работает.

Лидия Ермошина

Эти замечательные слова председателя Центризбиркома, вынесенные в эпиграф, являются весьма точной оценкой того, что есть белорусские выборы. Для Л. Ермошиной важно, чтобы внешне эта кампания выглядела пристойно, чтобы избиратели пришли и проголосовали. И государство над этим работает, иначе говоря, будет загонять людей на избирательные участки. Т. е. важна форма, содержание давно уже никого не волнует. Вырождение выборов как механизма избрания и смены власти произошло в Беларуси давно. Остался ритуал.

Тем не менее, выборы в любой стране, вне зависимости от степени их демократичности — это короткий момент общенациональной дискуссии. В этом смысле даже избирательная кампания, итог которой фатально предрешен, представляет интерес для исследователя. Какой главный месседж посылают кандидаты обществу? Какую основную тему они предлагают для обсуждения? Или, как говорят политтехнологи, о чем выборы? Всё это очень много говорит о состоянии умов в обществе, о способности общества и элиты адекватно оценивать исторические реалии, осознавать проблемы и находить их решения.

Напечатаны предвыборные программы всех кандидатов в президенты. Что обращает на себя внимание? Главный месседж Николая Улаховича — «За мир, покой и порядок!». Слоган кампании Сергея Гайдукевича — «Порядок в стране, достаток в доме». Основной смысл программы Александра Лукашенко — сохранить независимость, мир и порядок.

Таким образом, тезис о «порядке» звучит в качестве центрального у трех кандидатов. Очевидно, он навеян украинскими событиями. Беспорядок, который доминирует там, дает хороший повод белорусским лояльно-охранительным кандидатам на контрасте обращаться к идее порядка. Т. е. власти пытаются навязать обществу дилемму: мир или война, порядок или беспорядок? Дескать, выбирайте из этих двух альтернатив.

Если бы страна была на подъеме, то идея сохранения статус-кво, того, что есть, была бы вполне приемлема. Но проблема в том, что Беларусь сегодня в глубоком системном кризисе, существующая социальная модель себя исчерпала и стала тормозом развития общества. И на этом фоне идея порядка — это курс на застой, консервацию кризиса, загнивание.

Логика исторического процесса диктует поставить в повестку дня нынешней президентской кампании другую дилемму: сохранение статус-кво (стабильности, порядка) или развитие? Вот в противовес этим кандидатам Татьяна Короткевич предлагает идею «мирных перемен». Это основной слоган ее избирательной кампании. Но пока эта тема не стала главной в ходе кампании. Властям это невыгодно, их больше волнует явка. А в независимых СМИ, оппозиционной среде главной темой стал чисто тактический вопрос: надо ли оппозиционному кандидату участвовать в этих «выборах»?

ДИАГНОЗ



Личное мнение Валерия КАРБАЛЕВИЧА

Но вернемся к предвыборной программе А. Лукашенко, которая, по всем понятным причинам, нас интересует прежде всего. Основная идея документа сформулирована так: «Что имеем — не храним, потерявши — плачем» — так гласит народная мудрость». Кроме независимости, мира и порядка, А. Лукашенко еще обещает сохранение предприятий и рабочих мест. Не создание новых производств, не развитие экономики, а именно сохранение того, что есть.

Впервые за время правления А. Лукашенко делает такой акцент на независимость. При том, что социологические опросы не фиксируют увеличение в белорусском обществе ощущения какой-то опасности независимому существованию Беларуси. Видимо, это жест в сторону оппозиционного электората, который напуган действиями России в Украине.

Причем в программе независимость трактуется как величайшее достижение белорусского народа, к которому он шел веками. Хочу напомнить, что еще совсем недавно А. Лукашенко называл распад СССР, в результате которого появилась независимая Беларусь, страшной катастрофой, трагедией, несчастьем, и людей, вроде С. Шушкевича, причастных к этой беде, объявлял изменниками и преступниками.

Если подходить к программе А. Лукашенко скрупулезно, то там формально есть обещания на ближайшие пять лет. Но они сформулированы общими словами, казенным, бюрократическим языком, почти без конкретики. Типа повысить, углубить, расширить и улучшить.

Правда, есть несколько и конкретных пунктов. Но все они выглядят нереалистичными. Вот, например, Александр Лукашенко обещает «сокращение внешнего государственного долга». Теперь он только нарастает. В настоящий момент правительство ведет переговоры о новых кредитах сразу с двумя международными фондами: МВФ и ЕФСР. Ближайшие годы Беларусь будет получать основные деньги российского кредита на строительство АЭС (всего — $10 млрд). Плюс обещанные огромные китайские связанные кредиты. Иначе говоря, ударными темпами сооружается кредитная пирамида. Какое сокращение?!

Или вот еще. «Запрет на повышение старых и введение новых налогов в течение пяти лет. Любые изменения налогов — только в сторону уменьшения и упрощения». Хочу напомнить, что в проекте бюджета на следующий год, который подготовило правительство, предусмотрен целый ряд новых налогов и платежей. То ли А. Лукашенко об этом не подозревает, то ли левая рука не знает, что делает правая, то ли этот документ не имеет никакого отношения к реальности.

Вообще, создается впечатление, что подготовка предвыборной программы А. Лукашенко — это неохотное исполнение некоего скучного, но обязательного ритуала. Собственно, как и проведение самих президентских выборов. Мол, если уж вам так нужны эти выборы и эта программа, то вот, возьмите. Дескать, избиратели, как дети, чем бы не тешились, лишь бы не плакали.

Обратите внимание, какой состав доверенных лиц кандидата в президенты А. Лукашенко. С точки зрения эффективности агитационной кампании было бы логично, чтобы туда включили известных всей стране людей: популярных артистов, певцов, представителей культуры, знаменитых спортсменов или хотя бы руководителей массовых провластных общественных организаций. Но, удивительное дело, даже глава инициативной группы действующего президента, председатель ФПБ М. Орда не попал в этот список. Туда включены в основном руководители регионов, чиновники, депутаты. Т. е. люди, контролирующие проведение процедуры голосования и подведение итогов выборов. Иначе говоря, не агитация, а административный ресурс является главным.

К неожиданностям кампании можно отнести хорошее выступление Татьяны Короткевич па телевидению. Оно несколько испортило, казалось бы, идеальный сценарий выборов, реализуемый властями.

Ідэйны падзел «палітзаклапочаных»

Вырашыў скласці для фэйсбука два кароткія «палітычныя» спісы. Падстава для падзялення на дзве групы: стаўленне да выбараў прэзідэнта.

■ ІГАР ДРАКО

У абодвух спісах тыя «палітычна заклапочаныя» грамадзяне «апазіцыйна-альтэрнатыўнай афарбоўкі», што заяўляюць пра сваю пазіцыю публічна і больш-менш гучна ў СМІ ці сацыяльных сетках.

Журналістаў у спісах няма, нягледзячы на тое, што некаторыя з іх (і гаворка не пра дзяржаўныя медыя) ператварыліся ў прапагандыстаў і навязваюць сваю пазіцыю чытачам-гледачам-слухачам.

УДЗЕЛ У ВЫБАРАХ:

Юрый Варонежцаў, Андрэй Дзмітрыеў, Таццяна Караткевіч, Ігар Маслоўскі, Дзяніс Мельянцоў, Сяргей Чалы, Юрый Чавусаў, Ігар Лялькоў, Уладзімір Падгол, Вадзім Саранчукоў, Віталь Макаранка, Юрый Дракахруст, Стась Карпаў, Пётр Кузняцоў, Ігар Драко.

БАЙКОТ, ІГНАРАВАННЕ І ДА Т.П.

Уладзімір Някляеў, Аляксандр Фядута, Анатоль Лябедзька, Віктар Карняенка, Ірына Вештард, Юрый Губарэвіч, Аляксей Янукевіч, Уладзімір Мацкевіч, Павел Усаў, Юрый Меляшкевіч, Павел Севярынец, Віталь Рымашэўскі, Павел Вінаградаў, Зміцер Дашкевіч, Сяргей Калякін, Андрэй Саннікаў, Зянон Пазняк.

Хто з гэтых людзей сёння памыляецца, а хто мае рацыю?

Людзі з першага спісу, вядома ж, маюць аргументы для доказу таго, што яны маюць рацыю.

Людзі з другога спісу лёгка і таксама з аргументамі тлумачаць сваю пазіцыю, лічаць яе правільнай і ўказваюць на памылковасць нашай — людзей з першага спісу — пазіцыі.

А ШТО ПАКАЖА БУДУЧЫНЯ?

Нічога яна сама па сабе не пакажа, бо без «ацэньшчыкаў» ніякай будучыні няма. Тады, хто ацэніць падыходы першых і другіх? Нехта неангажаваны, напрыклад, Аляксандр Класкоўскі. Але ж ён з вышыні будучыні можа і пажартаваць: «І тыя, і другія мелі рацыю», альбо пажартуе інакш: «Абое рабое!..».

А што вы хочаце ад апазіцыі ў аўтарытарнай краіне ды пры народзе, якому даспадобы мірныя перамены, але без яго ўдзелу ў іх.

Сто лят жыцця вам, шаноўны спадар Аляксандр!.. Бо калі ж тая будучыня прыйдзе?..

Ермошина: Оппозиционеры против выборов

Миссия ОБСЕ на днях опубликует промежуточный отчет о ходе избирательной кампании в Беларуси. Об этом сообщила председатель Центризбиркома Беларуси Лидия Ермошина.

Как отметила глава ЦИК, некоторые политические силы в Беларуси работают на отрицательную оценку выборов со стороны международных наблюдателей.

«Это прежде всего оппозиционные политики, особенно те, кто не смог участвовать в выборах или выбыл из первого этапа избирательной кампании, не сумев собрать нужное количество подписей. Для них отрицательные результаты являются позитивным моментом. На это они и будут работать», — пояснила Лидия Ермошина.

ЦИК нацелен на то, чтобы оценка выборов была со знаком «плюс». То есть, чтобы в заключении был обозначен прогресс, а не регресс. «Мне бы очень хотелось ответить позитивно, с уверенностью. Но я не могу делать оценку за совершенно других людей, у которых задачи отличительны от моих», — обратила внимание она.

БелТА

«ВІШНЁВЫ САД»

Напал жарсцяў, якія разгарэліся вакол постаці Таццяны Караткевіч і яе выбарчай кампаніі, выклікае здзіўленне і патрабуе асэнсавання.

■ ЮРЫЙ ДРАКАХРУСТ

Выпадкаў, калі інтарэсы розных групаў, плыняў апазіцыі і ўсёй грамадзянскай супольнасці ўваходзілі ў жорсткі клінч, у найноўшай беларускай гісторыі было шмат. Усе гэтыя калізіі спараджалі канфлікты паміж прыхільнікамі адпаведных палітыкаў, але цяперашняга напалу, так прыгадваецца, не было і блізка. А тут — знявагі, абвінавачанні, разрывы адносінаў. Суцэльны Шэкспір.

Пры тым што па вялікім рахунку ніводзін з бакоў цяперашніх халівараў у глыбіні душы не лічыць, што поспех ці няўдача лініі, якую ён адстойвае, будзе мець лёсавызначальнае значэнне. Ну знялася б Караткевіч зараз з выбараў — дык што, абрынуўся б рэжым Лукашэнкі ад народнага байкоту? У куды больш крытычных сітуацыях не абрынаўся, а тут абрынецца? З чаго? І наадварот — ну паўдзельнічае Караткевіч у выбарах, атрымае свае адсоткі і што — асыпле Захад Лукашэнку золатам, рукі цалаваць яму будзе? Не асыпле і цалаваць не будзе.

Дык з чаго ж тады такія жарсці?

Магчыма, да пэўнай ступені цяперашнія жарсці падагравае пол кандыдаткі. І гэта не толькі ў беларускай палітыцы так, гэта і наогул у беларускім жыцці так — жанчына, якая імкліва робіць кар'еру, выклікае значна большае раздражненне, чым мужчына.

«ВЫ НЕ МАЕЦЕ ЗНАЧЭННЯ»

Але здаецца, што справа па вялікім рахунку ўсё ж не ў гэтым.

Ужо колькі гадоў у беларускай апазіцыі і ў незалежным грамадстве чутны енк — эх, вось прыйдзе маладое пакаленне, ну калі ж прыйдзе маладое пакаленне, як яно добра нам усім будзе, калі яно прыйдзе. Пры гэтым па змаўчанні неяк меркавалася, што гэтая нашая надзея і будучыня будзе такімі самымі, як папярэднікі, толькі маладзейшымі, пазбаўленымі досведу паразаў і памылак.

Дык вось яно і прыйшло. І зусім не такое, як чакалася.

І гэта — як бы ні ў чым канкрэтна і ва ўсім. Выйшаў БНФ з кампаніі Караткевіч — адзін з яе паплечнікаў кажа: нам жа лягчэй, не трэба тлумачыць, што мы не бээнэфаўцы. Нават ветэраны наменклатуры, якія падаліся ў «рэвалюцыю» — Ганчарык і Казулін, — не асмельваліся так сказаць. Як можна, БНФ — гэта ж святое, гэта ж легенда. А для каманды Караткевіч — цяжар, і яны гэта адкрыта кажуць.

Ганьба? Не, палітыка. Для каманды Караткевіч — усяго толькі палітыка.

Ці цяперашні суполны вердыкт экспертаў — праграма Караткевіч папулісцкая. У адказ — млявыя пярэчанні яе паплечнікаў, а пра сябе — здзіўленне з усмешкай: ну так, такая і ёсць, а якая ж перадвыбарчая праграма павінна быць? Яна ж не для разумнікаў пішацца.

Яшчэ цікавая дэталь — з'яўленне ў камандзе кандыдаткі былога эканаміста Сяргея Чалага. У беларускай апазіцыі і незалежным грамадстве хапае «саўлаў, якія сталі паўламі», дастаткова прыгадаць Анатоля Лябедзьку і Аляксандра Фядуту. Але апошнія неяк выказвалі шкадаванне ці нават каяліся ў тым, што некалі былі з Лукашэнкам. Толькі не Чалы. Паводле яго, тады была выдатная кампанія і выдатны кандыдат. Такі быў час. А цяпер змяніўся час, прыйшлі іншыя кампаніі і іншыя кандыдаты. А што вам не падабаецца?

І на абурэнне шаноўнай публікі гэтай жыццёвай філасофіяй (не аднаго Чалага і не пераважна яго, а ўсёй, так бы мовіць, кагорты) — не столькі нават пярэчанні, колькі абыякавасць і нават пэўнае задавальненне, як у выпадку з БНФ: ды не маюць значэння вашыя меркаванні, калі не падабаецца вам, то нават добра — спадабаецца іншым.

Наивные или злохитрые?

■ ПЕТР КУЗНЕЦОВ

Да, водораздел по идейным позициям налицо. Думал над этим в последние дни.

Есть пару вопросов, относительно такого критерия.

Допустим, да, люди ничего не ждут от выборов и не проявляют к ним большого интереса. Если не сейчас, то уже завтра это может выразиться в массовой неявке на участки.

Но, с другой стороны, будет ли это достижением тех, кто последовательно за бойкот или игнор из оппозиции? На чем строится их стратегия?

Вот Мацкевич В. В. и ряд других постоянно говорит, что неявка подорвет внутреннюю легитимность и режим должен будет что-то там предпринимать, может, дойдет и до какого-то «круглого стола».

А с какой такой стати?

Ермошина сказала четко: «Мы работаем над явкой» — они и дальше будут работать, потому что для них это, да, вызов.

Но в какой степени к этому вызову причастны те из оппозиции, кто за бойкот или игнор? Как мне представляется — ни в какой.

Ну потому, что достаточно социологию посмотреть. У всех оппозиционеров, кто к бойкоту призывает, антирейтинг в разы превышает рейтинг. Мацкевича В. В. вообще не существует в этом поле, в действительно массовом сознании. Тогда к чему могут призывать и что могут легитимизировать или делегитимизировать люди, у которых ноль влияния на общественное мнение?

У Короткевич перед Лебедько и другими есть уже одно неоспоримое преимущество, и оно как раз в том, что она — новый человек, у нее нет громадного и устойчивого, как Эверест, антирейтинга.

И в сухом остатке: если происходит стихийный бойкот, то есть люди не приходят на участки, это совсем не означает, что «победила» стратегия бойкотистов-игнористов, потому что это произойдет без них, это произойдет потому, что власть не найдет ответа на вызов в виде апатии населения от невозможности перемен. А если так, то с какой стати режиму принимать их мнение во внимание и садиться с ними за какой-то стол?

Режим будет искать свой ответ на этот вызов, а они останутся ровно в том же положении, в каком находятся сейчас. Где здесь политическая стратегия, какой предполагается результат? Это все мутно как минимум...

... И уже немного вне рамок темы: будь у нас политики хотя бы с рейтингом 20—30%, они могли бы реализовывать любую стратегию: что участие, что бойкот, и это приносило бы какие-то зримые результаты. То, что сегодня пытаются сделать бойкотисты — лишь попытка встроиться в начинающийся (только начинающийся) тренд апатии и неверия, и, возможно, потом, на каком-то этапе, приписать себе какой-то тактический успех. Лебедько скажет, что звал людей на рыбалку, они на рыбалку и поехали. Но совершенный ноль в стратегическом плане. Первый и главный этап реализации хоть первой стратегии, хоть второй — работа с людьми и получение поддержки от них. Все иное — саботаж.

Когда какой-нибудь наивный человек, вроде Юрия Рубцова, с которым я неоднократно лично общался, полагает, что эта стратегия может принести политический результат, ему простительно, он может и ошибаться. Но когда об этом говорят искушенные политики... То либо они неискушенные и не заслуживают права считаться лидерами, поскольку некомпетентны, либо они сознательно вводят в заблуждение наивных для того, чтобы продолжать ничего не делать и убеждать всех, будто что-то полезное делают...

ВОРАГІ ЗНОЙДЗЕНЫ

Апошнім часам тутэйшая прапаганда шукае вінаватых у рэвалюцыйных узрушэннях і войнах, якія адбываюцца на планеце. На яе думку, ворагамі міру і спакою сталі ЗША і іх саюзнікі, якія пад выглядам змагання за свабоды і правы чалавека ўмешваюцца ва ўнутраныя справы суверэнных краін.

Падлічыць дакладна колькасць прыхільнікаў такой тэорыі ў Беларусі немагчыма, але асмелюся сказаць, што іх нямала. Чаму я так мяркую? Таму, што ў нас злосныя нападкі на Захад не спыняюцца з часоў «халоднай вайны». Перапынак быў толькі ў драматычны час развалу СССР, калі яго найбольш актыўныя грамадзяне выступілі супраць сапраўдных віноўнікаў кепскага жыцця — нашчадкаў бальшавікоў, якія акапаліся ў Палітбюро ЦК КПСС, ваенна-прамысловым комплексе, армейскім генералітэце і КДБ.

Працяглая ідэалагічная апрацоўка бясследна не праходзіць. Варта было ўжо ў незалежнай Беларусі аўтарытарнай уладзе выступіць з абвінавачваннямі на адрас ЗША, а СМІ падхапіць пошук ворагаў, як насельніцтва адгукнулася. Яно зноў знаходзіцца пад прэсам агрэсіўных эмоцый, якія нагнятаюцца прапагандай, падобнай на савецкую. Расійская журналістка Л. Петраноўская заўважае: «Зрители за эти месяцы подверглись массовому эмоциональному изнасилованию, ковровой бомбардировке пропагандой». У выніку любыя беды, нават асабістыя, замбіраваны люд Беларусі і Расіі бяздумна спісвае на «праклятых амерыкосаў». А яшчэ гуляе фраза: «Нас поссорил Запад, а мы повелись». У «ворагі народа» залічваюцца таксама грамадзяне, якія маюць уласную думку, што не супадае з афіцыйнымі ідэалагічнымі канонамі.

Мне ж прычына народных узрушэнняў бачыцца не ў знешніх фактарах і не ў наяўнасці кволай апазіцыі. Само кіраўніцтва краін сваім паталагічным уладалюбствам, няздольнасцю спыніць чыноўніцкія крадзяжы, злоўжыванне службовым становішчам, наладзіць развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы штурхае насельніцтва да пратэсту. Нездарма на шматтысячных мітынгах у Арменіі і Малдове людзі заявілі, што іхнія дзяржавы раз'ядае татальная карупцыя, якая «існуе пры падтрымцы ўлады і праваахоўных органаў». На такім жа палітычным грунце ўзнік украінскі Майдан. Яшчэ раней грамадзяне Беларусі і Расіі выходзілі на плошчы, выступаючы супраць фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў, пакуль не былі канчаткова застрашаны дубінкамі і зброяй.

На жаль, палітычная свядомасць насельніцтва постсавецкай тэрыторы развіта недастаткова. Людзей традыцыйна больш клапоцяць эканамічныя праблемы, якія застаюцца вострымі. Доўгае праўленне ўзурпатараў улады поспехаў не прынесла. Дабрабыт коціцца ўніз. Напрыклад, у Беларусі памер сярэдняй зарплаты вярнуўся на ўзровень 2009 года. Кожны сёмы расіянін знаходзіцца за рысай беднасці.

У краінах, якія на працягу XX стагоддзя выйшлі ў эканамічныя і палітычныя авангард свету, усе сферы дзейнасці развіваліся гарманічна, дапамагаючы адна другой. Тут не было перакосаў, рыўка нейкай галіны за кошт астатніх. А СССР пераадольваў адставанне ад Захаду фарсіраванымі метадамі, якія не прыносяць стабільнага развіцця. Сталінская «даганяючая мадэрнізацыя» ў першую чаргу тычылася арміі і цяжкай прамысловасці, праводзілася за кошт высмоктвання ўсіх сіл з вёскі, а таксама рабскай працы мільёнаў палітычных зняволеных. Лепшыя навуковыя і тэхнічныя кадры былі кінуты на вынаходніцтва і выраб атамнай зброі, затым на касмічныя праграмы, а для людзей ніяк не маглі зрабіць прыстойныя аўтамабілі, бытавую тэхніку,

Пункт гледжання



паэта Сяргея **ЗАКОННІКАВА**

вопратку, абутак, пастаянна не хапала харчавання.

Дыктатар, акрамя таго што спаліў у класавай барацьбе, у войнах дзесяткі мільёнаў чалавек, яшчэ пакінуў шмат праблем эканамічнага і маральнага кшталту, якія мы расхлёбваем да гэтага часу. Рысы былога сталінскага прыгону захоўваюцца ў беларускай прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Насельніцтва, як і раней, збіваецца патрыятычнымі лозунгамі, пампезнымі парадамі, ваенізаванымі гульнямі, нянавісцю да прыдуманых «ворагаў» у безаблічны, шэры натоўп, якім лёгка маніпуляваць.

Расійскі біёлаг А. Маркаў сцвярджае: «Ничто так не сплачивает коллектив, как совместное противостояние другим коллективам; множество внешних врагов — обязательное условие существования тоталитарных империй и надежное средство «сплочения» населения в альтруистический муравейник...» Пад такое азначэнне трапляе і Беларусь. Хоць гэта сярэдняя па тэрыторыі і колькасці насельніцтва, мананацыянальная і — галоўнае — незалежная краіна, але для Расіі яна застаецца аскалёпкам царскай і савецкай імперый, які хочацца асіміляваць, далучыць да свайго абсягу.

Кругавая парука аўтакратаў, якія б спрэчкі паміж імі ні разгараліся, мацнее. Яны трымаюцца адзін за аднаго і абнахабелі да таго ступені, што могуць беспакарана вылiваць слоўны бруд на Захад, на галовы тых, хто ратуе іхнюю правальную эканоміку.

Гэта новы аспект міжнароднага жыцця. У той час як аўтарытарызм у свеце пашыраецца, адкрыта вядзе знешнія «халодныя» і ўнутраныя «гарачыя» войны, ламаючы лёсы людзей, над ім вырас «ахоўны парасон» дыпламатычнай валтузні: кіраўнікі дэмакратычных краін, вядомыя грамадскія дзеячы, у тым ліку і папа рымскі, сустракаюцца з дыктатарамі, паціскаюць рукі, надаюць ім незаслужанага аўтарытэту; легітымныя парламентары на роўных засядаюць з нелегітымнымі; за спіной прыгнечаных народаў вядуцца пастаянныя таемныя перамовы. Усё гэта абурае сумленных людзей, якія цвёрда стаяць за праўду і справядлівасць.

Узурпатары ўлады асуджаюць рэвалюцыйны народны рух, са здзекам заяўляюць пра бяссілле дэмакратычнай супольнасці спыніць ваенныя дзеянні ў «гарачых кропках». У мяне на гэта ёсць адказ: калі на тэрыторыі былога СССР і ў іншых месцах планеты дыктатараў развялося, як у пару гніення садавіны мух-дразафіл, то паспрабуй справіцца з вынікамі іхняга кіравання!

Безумоўна, да рэвалюцыйна настроеных мас, да сапраўдных змагароў за свабоду і правы чалавека абавязкова прымазваюцца крымінальныя элементы, рэлігійныя фанаты, звычайныя хуліганы, у іх шэрагі актыўна засылаюцца правакатары са спецслужбаў. А затым усе злачынныя дзеянні прыпісваюцца дэмакратам. Якраз гэта стала выразнай прыкметай сучасных пратэстных падзей. Дык што, не варта змагацца? Трэба! Хоць у «ворагі народа» можна лёгка залічыць крытычна настроеных грамадзян, але ўсяму насельніцтву, якое паўстала, такі ярлык прыклеіць немагчыма.

Кіраўнікі Расіі, якая вядзе неабвяўленую вайну супраць Украіны, і Беларусі палохаюць абывацеляў пралітай крывёю. Але яна з'яўляецца на вуліцах і плошчах якраз там, дзе сярэдні чалавек, прабраўшыся на самы верх улады, забываецца пра сваю звычайнасць і заяўляе: «Дзяржава — гэта я!» Калі ты шукаеш ворагаў, лепш глянь у люстэрка! Вядомы кампазітар і спявак А. Макарэвіч разумна кажа: «А уж если решили подражать Америке — может, сначала научиться у них, как сделать выборы честными, суды независимыми, а ВВП — высоким? А там, глядишь, и секретные спецоперации не понадобятся?»

Нельга бяздумна ісці за прапагандай, якая нараджае сказоную свядомасць. Канкрэтная задачы ў жыцці рашаюцца не ідэалогіяй, а на грунце непахісных этычных правілаў, напрацаваных чалавецтвам, і здаровага сэнсу.

НАШАЙ ПАЛІТЫКІ

Як не маюць, ды што ж гэта робіцца? Мы ж — соль зямлі беларускай, духоўная эліта, уладары думак, настаўнікі народу. Вось так — не маюць і ўсё. «Без нас», як пісаў Валянцін Акудовіч.

ПАЛІТЫКА ЯК БІЗНЕС

У разуменні «пакалення Караткевіч» палітыка — той самы бізнес. Капітал — галасы ці шырэй — народная любоў. Галасы ў Беларусі лічаць вядома як, але вось народную любоў не Ярмошына вызначае. І ёсць моцнае падазрэнне, што і не прасунутая публіка таксама.

Вось экзістэнцыйны жах ад сутыкнення з гэтай новай філасофіяй не толькі палітыкі, але і жыцця, і лягжыць, так выглядае, у аснове цяперашніх спрэчак і жарсцяў вакол сёлетняй выбарчай кампаніі.

Гэтак сама як гераіню чэхаўскага «Вішнёвага саду» Ранеўскую жахала сама прапанова бізнэсоўца Лапахіна — як так, любімы да слёз вішнёвы сад, у якім прайшло дзяцінства, юнацтва, ссячы і перетвараць у летнікі пад арэнду? Ды гэта ж... Фінал, спадзяюся, усе памятаюць.

Самы тон маёй нарацыі, як і літаратурная аналогія (фінал «Вішнёвага саду» сапраўды вядомы), магчыма, схіляе да высновы, што гэтае новае непазбежнае і яму трэба пляскаць у ладкі. Насамрэч зусім не. Ці не зусім так.

Неабавязкова новае — гэта лепшае. Неабавязкова новае перамагае, робіцца мэйнстрымам. Даводзілася неяк пісаць, што любая грамадская норма — гэта могілкі спробаў яе змяніць.

СЯКЕРЫ Ў ВІШНЁВЫМ САДЗЕ

Я толькі пра выклік, кінуты тым самым нормам, якімі шмат гадоў жыла і жывілася беларуская грамадзянская супольнасць. Выклікі неабавязкова разбураюць (ці неабавязкова адразу разбураюць) норму.

А можа на працягу наступнага месяца пратэстная хваля ў Беларусі будзе нарастаць, як снежны камяк, 11 кастрычніка краіна перажыве катарсіс пустых выбарчых участкаў? Чаму не — абсалютна рэальная рэч. Так бывае, прынамсі.

Тады якая такая Караткевіч, хто такая Караткевіч?

Ці нават усё больш банальна, звыкла і сумна: не пойдзе за Караткевіч апазіцыйны электарат, не прыцягне яна нікога іншага, набярэ свой мізэр, булькне, як і не было — і праз пэўны час толькі адмыслоўцы прыгадаюць, што была такая. Выклік? Які выклік? Не было ж нічога.

Тым больш, што сама нашая гераіня наконт выкліку — крышачку як у «12 крэслах»: «Калі б Астап ведаў, што гуляе такія мудрагелістыя партыі і сутыкаецца з такой выпрабаванай абаронай, то вельмі б здзівіўся — справа ў тым, што гросмайстар гуляў у шахматы другі раз у жыцці».

Але жыццё не канчаецца сёлетнімі выбарамі, і нешта мне падказвае, што і наступны выклік будзе такога самага кшталту, будзе падобны на сёлетні.

Што мяне не тое каб вельмі радавала. Той вішнёвы сад 80—90-х мінулага стагоддзя — гэта ж вішнёвы сад і майго юнацтва. Але ў стылістыцы, у філасофіі кампаніі Таццяны Караткевіч я чую гукі сякераў у гэтым вішнёвым садзе.

Вершаваныя фельетоны

Нікому не вядома, адкуль у іх харомы

Газета «Наша Ніва» апублікавала спіс чыноўнікаў, якія пабудавалі катэджы ў Драздах, Вяснінцы і за «Мінск-Арэнай». Спрэс — прадстаўнікі прэзідэнцкай эліты! Ледзь не самы сціплы з катэджаў у былога міністра юстыцыі Віктара Галаванава. Будынак зараз выстаўлены на продаж коштам… 1 мільён 400 тысяч даляраў! Калі жыць на сярэдні беларускі заробак і плаціць падаткі, на катэдж былога міністра давядзецца ашчаджаць 330 гадоў.

Звычайна шлях да ўлады коўзкі,
Не кожнаму — такі вянец…
Тым болей дзіўна, калі з вёскі
У людзі выб'ецца хлапец.
Прынамсі, шанцаў вельмі мала
Вяскоўцу атрымаць партфель.
А Петраку пашанцавала,
Ён «стрэліў» акурат у цэль!
Як ззаду засталася школа
І трапіў ён у інстытут,
Дык па сцяжынцы камсамола
Паджгаў наперад без пакут.
Затым яго, само сабою,
Чакаў партыйны камітэт.
Вяршыні браў Пятрок без бою,
Бо трапіў, мовіць так, у след.
Кар'ера рухалася быстра.
Як Бацьку нам падкінуў лёс,
Дык да вяльможнага міністра
Пятрок пранырлівы дарос.
Краіну нашу ў бездань несла,
І галадаў амаль народ,
А Петраку пасада-крэсла
Давала шмат даброт-выгод.
Як быццам на карысць Радзімы
Ён працаваў у дзве рукі…
Хвалу спявалі падхалімы,
Савалі штосьці «хадакі»…
Пятру абрыдзеў побыт шэры.
Таму не дзіва, што няўзнак
Заместа гарадской кватэры
Займеў дыхтоўны асабняк.
Не спадцішка, зусім адкрыта
Пайшоў Пятро на крок такі,
Бо збудавала ўся эліта
Падобныя асабнякі.
Яны, сапраўдныя харомы,
Павырасталі, як грыбы!
Адкуль жа грошы — невядома,
Іх з неба скінуў Бог нібы…
А каб развеяць чуткі-плёткі,
Крычаў Пятро з усіх трыбун:
— Сумленна зарабіў я сродкі,
Штодня кручуся, як юон!
Таму няхай не коле вочы
Зайздроснікам маё дабро.
— Працую я, як конь рабочы! —
Даводзіў з тых трыбун Пятро.
Вось так і жыў ён у раскошы,
Зусім не меў згрызот-пакут.
А людзі для яго — як вошы,
Як недарэчны хлам і хлуд.
Аднойчы не зусім чаканы
«Мабіла» выдала званок.
І з трубкі — голас злёгку п'яны:
— Дык і здароў, сябрук Пятрок!
Пятро на слых пазнаў Міколу,
І гэта, мусібыць, не ўздзіў:
Калісьці разам з ім у школу,
Як быў малечаю, хадзіў.
Сядзелі за адною партай
Гадоў дзясятак — бок у бок.
Удвух навуку грызлі ўпарта
І разам мацалі дзявок.
Хоцьназаляла ў клёпках штосьці,
Працівілася ўсё нутро,
Ды змусіўся пазваць у госці
Міколу ў рэшце рэшт Пятро.
Калі ўзялі па добрай шклянцы,
Дык развязалі языкі.
— Былі абодва мы заср…нцы,
А ты цяпер «бугор» такі!
Я не пра пост, не пра кар'еру,
Якую ты зрабіў, Пятрок.
Шыкоўны асабняк не ў меру.
Як ты дамогся? Дай урок:
Ты ладзіш сходні і прыёмы,
А я працую ля станка…
Ды ўсё ж чаму ў цябе харомы,
А я не маю і дамка?
Раўня амаль у нас зарплаты,
А твой катэдж такі «круты»!
Чаму ж ты гэтакі багаты?
— Багаты я,
Бо бедны ты…

Ці хлынуць у Ізраіль путан тутэйшых зграі?

Урад Ізраіля нарэшце прагаласаваў за ўвядзенне бязвізавага рэжыму з Беларуссю. Аднак многія дэпутаты кнэсету пратэставалі: маўляў, рашэнне — раўня падпісанню дамовы аб гандлі людзьмі, бо на «запаветную зямлю» цяпер хлынуць беларускія прастытуткі…

Цяпер нягегла мы жывём,
Няма ніякай перспектывы,
Ва ўсім, так мовіць бы, аблом,
А гандаль — і зусім паршывы.
Бягуць ад нас пакупнікі,
Як ад заразнае праказы:
Не трэба нашыя станкі,
БелАЗы, трактары і МАЗы.
Народ як можаш выжывай…
Надзей нямашака ні трошкі:
Ужо не трэба каравай —
Не страціцца бы і хлеба крошкі.
І што рабіць?
Калі на ўрад
Няма ніякае спадзеўкі,
Дык, як заазвычай, акурат
На помач прыйдуць нашы дзеўкі.
Пра беларусак-прыгажунь
Ідуць па свеце пагалоскі:
Прылашчы, да сябе прысунь —
І рай, як кажуць, мецьмеш боскі…
Дык чым не экспартны тавар
У голад нашыя дзяўчаты?
І тут даляр, і там даляр,
Глядзіш — і родны край багаты.
Няхай паруняцца яны
І спраўдзяць нашыя надзеі!
Але ў Ізраілі ў званы
Забілі ў кнэсеце яўрэі.
Яны народ амаль што наш —
Калісь жылі ў адным кагале.
І быў яўрэй — як той бульбаш,
Тут падрастаў на бульбе й сале.
Разваг залішніх не было
Пра лад жыцця,
Пра рознасць нацый,
І не лічыў яўрэй за зло,
Як цыцкі нашай дзеўкі мацаў.
Часіны іншыя прыйшлі,
Не варым больш агульнай кашы:
Да «запаветнае зямлі»
Паехалі яўрэі нашы.
Там, палічылі, рай зямны.
У іх цяпер свае «Марусі»,
Ды помняць, тым не менш, яны
Пра пекных дзевак з Беларусі.
Відаць, паведамілі ўсім
Пра тыя колішнія страсці.
З таго не радасць нам зусім —
Ледзь не займелі мы няшчасце.
Калі рашыў тамтэйшы ўрад,
Што можна ездзіць нам без візы,
Пачуў ён нараканняў шмат:
Маўляў, чакаюцца сюрпрызы,
Разбэсціцца мужчынскі люд,
І паглыне святы Ізраіль
Дасюль нязнаны грэшны блуд,
Бо хлынуць прастытутак зграі;
Маўляў, за гэткі блуд затым
Бог пакарае нас сурова.
Ды клопат бачыцца пустым,
Злавацць не будзе Іегова:
Ну колькі там таго граху?
Не зломяць дзеўкі вашы ложкі…
Вам — плоцкай радасці крыху,
І бедным нам — валюты трошкі…

* * *

Напрыканцы скажу ўсур'ёз:
Не радасна, як ходзяць чуткі,
Што ў беларусаў — горкі лёс
І нашы дзеўкі — прастытуткі.

Алесь НЯЎВЕСЬ

Новыя фельетоны Алеся НЯЎВЕСЯ можна пачытаць на сайце: http://alesnauwes.com/.

Давыдько: Нужно будет прощения попросить у футбольных фанатов

Руководитель Белтелерадиокомпании Геннадий Давыдько говорит, что назвал нацистами болельщиков, которые были на матче во Львове, «сгоряча». Об этом он заявил в комментарии «Еврорадио».

— Про этих фанатов, болельщиков футбольных — мне неприятно, что там недоразумения есть. Будто бы обиделись на меня, что я назвал их нацистами... Ну, это я «сгоряча», пожалуй, прощения нужно просить.

Напомним, в последнем выпуске программы «Клуб редакторов» обсуждался футбольный матч сборных Украины и Беларуси и поведение во время него белорусских и украинских болельщиков. Геннадия Давыдько возмутили «антироссийские речевки», которые звучали во время матча, и то, что белорусские болельщики охотно их поддерживали. «Почему нашу страну на трибунах в соседней стране представляют юные нацисты?» — возмущался руководитель БТ.

Один из болельщиков сборной Беларуси по футболу написал руководителю БТ открытое письмо по поводу этого его высказывания. Андрей Вальковский требует в своем письме, чтобы Геннадий Давыдько представил доказательства своему обвинению: «Насколько я понимаю, у вас есть неоспоримые доказательства то ли принадлежности посетителей гостевого сектора к формальным или неформальным нацистским группировкам, то ли употребления во время матча или перед ним или после него нацистской символики, то ли публичных нацистских выкриков. Было бы чрезвычайно уместно представить эти доказательства широкой публике».

«Еврорадио»

ЕС приостановит санкции?

Европейский союз готовится приостановить санкции, введенные в отношении президента Беларуси Александра Лукашенко. Об этом сообщило 17 сентября агентство Reuters.

«ЕС, вероятно, приостановит некоторые санкции против Беларуси, включая запрет на поездки для президента Александра Лукашенко, после того, как он в прошлом месяце освободил группу политических заключенных», — цитирует агентство дипломатические источники. «В качестве попытки улучшить отношения с человеком, которого Запад называет «последним диктатором Европы», дипломаты рассматривают возможность приостановки запрета на выдачу виз и замораживание активов, введенных в отношении почти 200 человек в связи с нарушением прав, в том числе после выборов 2004 года, результаты которых были оспорены», — пишет агентство.

«Эта мера (приостановка санкций) может быть распространена на Лукашенко, а также на судей и политиков, близких к президенту», — утверждает Reuters.

Доходы продолжают падать

Реальные доходы белорусов в январе—августе этого года упали на 5,1% по сравнению с аналогичным периодом прошлого года, сообщает Белстат. Сокращение денежных поступлений продолжается с апреля 2014 года.

В структуре денежных доходов населения, то есть доходов за вычетом налогов, сборов и взносов, скорректированных на инфляцию, преобладает зарплата (60,9%). Еще 23% составляют соцвыплаты: пенсии, пособия и стипендии. На предпринимательскую деятельность приходится 8% всех доходов белорусов. Денежные поступления от собственности и из других источников составляют 8,1%.

В последний раз реальные денежные доходы белорусов незначительно выросли в марте 2014 года и оставались неизменными в апреле. Но уже с мая прошлого года реальные денежные поступления стали сокращаться.

Напомним, с начала этого года цены в Беларуси поднялись на 7,8%. Больше всего в январе—августе подорожали платные услуги — на 12,3%, а меньше всего — продовольствие (+5,4%), сообщает Белстат. В августе, как и месяцем ранее, инфляция составила 0,2%. Значительней всего в прошлом месяце цены выросли на авиабилеты и услуги турфирм.

TUT.BY

Канцэпцыя сумленнасці

Адбылася прэзентацыя Канцэпцыі рэформы судовай сістэмы.

■ АЛЯКСАНДР ТАМКОВІЧ

Цалкам згодны з Паўлам Севярынцам, які лічыць, што сярод іншых важных прычын менавіта па прычыне адсутнасці такіх праектаў Украіна ўпусціла час і страціла Крым з Данбасам. Таксама цалкам згодны і з Гары Паганяйла, які прапануе жыць па прынцыпу «тут і цяпер», то бок дабівацца вынікаў, не чакаючы «лепшых часоў».

